Мінск — кніжная сталіца свету-2017?

Ерэван — 2012. Бангкок — 2013. Абуджа — 2014. Гэта кароткі пералік гарадоў, якія былі аб'яўленыя ЮНЕСКА Кніжнымі сталіцамі свету. У 2017 годзе на гэтае ганаровае званне ў ліку іншых будзе прэтэндаваць і Мінск. Пытанне падрыхтоўкі намінацыйнага дасье, распрацоўкі дзяржаўнай праграмы развіцця і папулярызацыі чытання, пошуку новых шляхоў прапаганды кнігі сёння вельмі важнае. Яно павінна вырашацца на самым высокім узроўні, з удзелам шырокай грамадскасці. Кніга з'яўляецца брэндам нашай краіны, пра яе ролю неаднойчы казаў кіраўнік дзяржавы, ды і 500-годзе нацыянальнага кнігадрукавання — добрая перадумова заяўкі для ЮНЕСКА.

Прызначэнне Мінска кніжнай сталіцай свету — вельмі вялікая падзея. Каб так сталася, каб мы перамаглі ў барацьбе за гэтае званне з іншымі дзяржавамі, мы павінны паяднаць свае намаганні: і дзяржаўныя супрацоўнікі, і журналісты, і пісьменнікі, і чытачы. Каб абмеркаваць актуальныя пытанні падрыхтоўкі намінацыйнага дасье для ЮНЕСКА, разгледзець новыя цікавыя прапановы і акрэсліць магчымыя шляхі папулярызацыі кнігі ў дзяржаве, за «круглым сталом» у грамадскім прэс-цэнтры Дома прэсы сабраліся прадстаўнікі Міністэрстваў інфармацыі і культуры Беларусі, Нацыянальнай бібліятэкі краіны, кіраўнікі грамадскіх арганізацый, пісьменнікі, выдаўцы.

> *Гэты праект можа быць паспяхова рэалізаваны толькі пры цесным супрацоўніцтве дзяржаўных органаў, устаноў і арганізацый, грамадскіх арганізацый і шырокай грамадскасці. Бо асноўная яго ідэя — рашэнне праблем папулярызацыі чытання ва ўсіх краінах. Яна сёння мае глабальны характар, таму ў многіх краінах праграмы па прасоўванні, падтрымцы чытання маюць статус дзяржаўных.*

Алесь Суша, намеснік дырэктара Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі па навуковай і выдавецкай дзейнасці:

— Беларусь — нацыя кнігі, народ кнігі. Нездарма найбольш вядомымі, яркімі асобамі нашай культуры былі людзі, так ці інакш звязаныя з кнігай. Гэта кнігавыдаўцы, пісьменнікі, даследчыкі. І калі прыгадваць мінуўшчыну, то ў свядомасць найперш прыходзяць імёны людзей кніжных — Францыска Скарыны, Еўфрасінні Полацкай, Кірылы Тураўскага, Льва Сапегі. Таму сёння, знаходзячыся напярэдадні надзвычай важнага юбілею — 500–годдзя беларускага кнігадрукавання, мы ўсё часцей пачынаем задумвацца пра выключную ролю кнігі ў нашым жыцці і ў станаўленні, развіцці айчыннай культуры. Калі аналізаваць працэсы, што адбываюцца сёння ў айчынным кнігавыданні, можна заўважыць шмат станоўчых з'яў: адно за адным выходзяць факсімільныя выданні, з'яўляюцца цудоўныя альбомы, нашы кнігі завaёўваюць шматлікія прэміі, прызы на міжнародных конкурсах «Мастацтва кнігі»…

Ідэя правесці святкаванне 500-годдзя беларускага і славянскага кнігадрукавання на міжнародным узроўні з'явілася прыкладна два гады таму, калі планавалася, што Сусветнай сталіцай кнігі стане Ерэван. Тады нашымі армянскімі калегамі быў праведзены цэлы шэраг падрыхтоўчых мерапрыемстваў. Думаецца, гэта сапраўдны ўзор, якім чынам кніга — а для армян гэта таксама святое паняцце — здольная паказаць узровень развіцця культуры нацыі ў цэлым. Вось тады і быў распачаты шэраг абмеркаванняў, ці можа Мінск і, шырэй, Беларусь стаць стаць кніжнай сталіцай на 2017-ы?

Год таму на Міжнародным кангрэсе «Нацыянальная бібліятэка як феномен культуры» прайшлі рэгіянальныя кансультацыі ЮНЕСКА з удзелам прадстаўніка гэтай міжнароднай арганізацыі Яніса Карклінса, дзе абмяркоўвалася пытанне магчымасці ўдзелу Беларусі ў гэтым праекце. Такая ініцыятыва была папярэдне падтрыманая, прычым агульная зацікаўленасць ідэяй узнікла не толькі з боку Беларусі, але і з боку ЮНЕСКА. З таго часу мы ўсё часцей задумваемся пра тое, што можа быць зроблена да 2017 года. Варта падкрэсліць, што пэўныя напрацоўкі намі ўжо назапашаныя.

У цэлым я лічу, што Беларусь можа прэтэндаваць на званне Сусветнай сталіцы кніжнасці, у тым ліку і горад Мінск. Можна казаць і пра іншыя гарады, да прыкладу, Полацк як радзіму Францыска Скарыны, Еўфрасінні Полацкай, Сімяона Полацкага. Але, мусіць, толькі горад Мінск з найлепш адбудаваній інфраструктурай здольны прыняць вялікую колькасць турыстаў, правесці шматлікія мерапрыемствы, стаць адным з асноўных цэнтраў свята. Але гэта не выключае магчымасці яго правядзення ў розных месцах і гарадах нашай краіны.

Натуральна, 500-годдзе беларускага кнігадрукавання — гэта не больш чым нагода для таго, каб нашай краіне намінавацца на гэты высокі статус ЮНЕСКА. Гэта мусіць быць важным фактам, які нам дапаможа. Але асноўны крытэрый, на які звяртае ўвагу ЮНЕСКА пры адборы загадзя падрыхтаваных намінацыйных дасье, — сучасная праграма развіцця чытання, культуры кнігі, кніжнасці, папулярызацыя чытання ў асяроддзі розных груп грамадства. Натуральна, у гэтым аспекце нам таксама ёсць чым ганарыцца: дасягненні з боку бібліятэчнай грамадскасці, кнігавыдавецкіх устаноў, кнігагандлёвых цэнтраў. Думаю, мы таксама можам казаць пра шматлікія станоўчыя зрухі ў галіне навуковай і сацыякультурнай дзейнасці ў плане прапаганды кнігі.

> *…трэба думаць перш за ўсё пра тое, якую кнігу мы будзем папулярызаваць. Гэта павінна быць беларуская кніга, магчыма, выдадзеная на розных мовах. Гэта можа стаць тым плюсам, што дазволіць нам дамагчыся гонару называцца кніжнай сталіцай свету-2017.*

Больш за тое, ужо створаная міжведамасная рабочая група, якая распрацавала цэлы шэраг прапаноў па правядзенні маштабнага кніжнага свята, якія могуць быць рэалізаванымі да 2017 года на вельмі высокім міжнародным узроўні. Справа змагання за статус Сусветнай сталіцы кнігі — надзвычай няпростая. Да прыкладу, на 2014 год намініраваўся моцны кніжны цэнтр — Вільнюс — і не прайшоў. Многія буйныя гарады свету ўжо падавалі свае дасье і таксама не прайшлі. Таму сёння нам трэба вельмі разумна і актыўна папрацаваць, каб наша намінацыйная заяўка для ЮНЕСКА выглядала прыстойна.

Наталля Задзяркоўская, галоўны спецыяліст управлення ўстаноў культуры і народнай творчасці Міністэрства культуры Рэспублікі Беларусь:

— Мне бачыцца вельмі лагічным, што гэтую гаворку распачаў прадстаўнік Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі, бо менавіта гэтая ўстанова стала адным з ініцыятараў праекта. Вельмі прыемна бачыць тут Тадэуша Стружэцкага, чалавека, які стаяў ля самых яго вытокаў. Гаворка пра ўдзел Мінска ў гэтым праекце пачала весціся яшчэ ў 2012 годзе, які быў у нашай краіне аб'яўлены Годам кнігі. Калі Міністэрства культуры Беларусі падводзіла вынікі мерапрыемстваў, што былі праведзеныя цягам гэтага года, стала зразумела, што работу па папулярызацыі чытання, кнігі трэба працягваць і надалей. Тады, на пачатку 2013 года, ад Міністэрства культуры мы накіравалі афіцыйны ліст ва Урад Рэспублікі Беларусь. Там была змешчана прапанова правесці работу па вылучэнні горада Мінска на атрыманне статусу Сусветнай сталіцы кнігі. Нашу ініцыятыву падтрымалі Міністэрства інфармацыі і Міністэрства замежных спраў Беларусі.

У сярэдзіне 2013 года мы атрымалі ліст у падтрымку ініцыятывы ад Савета міністраў за подпісам намесніка прэм'ер-міністра краіны Анатоля Тозіка. Таму пры Міністэрстве культуры была створана рабочая група, у склад якой увайшлі прадстаўнікі Мінскага гарадскога выканаўчага камітэта, міністэрстваў культуры, інфармацыі, замежных спраў краіны, Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі. Старшынёй рабочай групы быў прызначаны намеснік міністра культуры краіны Васіль Чэрнік. Першае пасяджэнне рабочай групы адбылося ў жніўні 2013 года. У якасці сусветнай сталіцы кнігі-2017 мы прапаноўваем вылучыць менавіта Мінск, хоць раней ішла гаворка і пра Полацк.

Варта падкрэсліць, што часу на падрыхтоўку дасье і складанне прапаноў па правядзенні свята ў нас не так і шмат. Згодна з правіламі падачы намінацыйнай заяўкі, мы павінны накіраваць матэрыялы ў ЮНЕСКА за 2 гады да плануемай даты. Таму апошні тэрмін — красавік 2015 года. Застаецца вельмі мала часу, і на працягу 2014-га варта працаваць надзвычай актыўна.

Што ўжо зроблена і куды будзем рухацца далей? Мы паставілі перад сабой мэту сабраць прапановы па правядзенні мерапрыемстваў, што ўвойдуць у намінацыйную заяўку. Ужо ёсць вельмі цікавыя ідэі імпрэз, прапанаваныя Мінгарвыканкамам і Нацыянальнай бібліятэкай, вельмі актыўна міркуюць прымаць удзел у святкаванні менавіта дзіцячыя бібліятэкі. Яны распрацавалі канцэпцыю шэрагу акцый, імпрэз па папулярызацыі дзіцячага чытання. Чакаем прапаноў ад Міністэрства інфармацыі: зразумела, на іх вялікія спадзяванні, бо непасрэднымі ўдзельнікамі святкавання мусяць стаць кнігагандлёвыя і кнігавыдавецкія арганізацыі.

У пачатку 2014 года зноў адбудзецца пасяджэнне рабочай групы, дзе будуць дэталёва разглядацца дасланыя прапановы, фармулявацца новыя ідэі. Варта падкрэсліць, што ў нас ужо ёсць цікавыя ідэі, але мы пакуль атрымалі іх не ад усіх, ад каго хацелі.

Адным з крытэрыяў адбору кніжнай сталіцы свету з'яўляецца ступень удзелу ў гэтым праекце рэгіёнаў. Чым больш актыўны ўдзел у святкаванні будуць браць рэгіёны, тым больш шанцаў мае горад на вылучэнне. Мы ніяк не абмяжоўваем фантазіі прапаноўцаў, чым цікавейшымі будуць ідэі, тым лепей. Падчас пасяджэння рабочай групы мы нават стараліся прыдумаць нейкую «фішку», каб наша заяўка адрознівалася ад іншых прапаноў.

Кансультант управлення выдавецкай дзейнасці і кніжнага гандлю Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь Людміла Быкава:

— У працяг выступлення Наталлі Іванаўны хачу адзначыць, што цяпер Міністэрствам інфармацыі краіны вядзецца актыўная праца па акумуліраванні прапаноў для правядзення гэтага значнага свята. Усе ідэі, канцэпцыі ў асноўным звязаныя з кнігамі, але мы мяркуем, што не варта абмяжоўвацца толькі кнігамі. Што ж да непасрэднага ўдзелу Міністэрства інфармацыі, то мы будзем забяспечваць аказанне самай актыўнай інфармацыйнай падтрымкі ўсіх мерапрыемстваў у межах падрыхтоўкі да святкавання.

Папулярызацыя кнігі і прапаганда чытання — адзін з прыярытэтных кірункаў працы Міністэрства інфармацыі Рэспублікі Беларусь. Ужо добрай традыцыяй становіцца правядзенне Каляднага дабрачыннага балю кнігі — унікальнага мерапрыемства, закліканага не толькі сабраць сродкі для падтрымкі дзіцячых дамоў, але і прадэманстраваць значнасць кнігі і чытання, вылучыць самыя яркія выдавецкія праекты года. Але цяпер найбольш актуальная справа для нас — падрыхтоўка да XXI Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу, што пройдзе ў лютым. Падчас кніжнай выстаўкі мы таксама будзем рабіць акцэнт на тое, што наш горад рыхтуецца прэтэндаваць на атрыманне падобнага высокага статусу.

Варта адзначыць, што і ў падрыхтоўцы намінацыйнай заяўкі Міністэрства інфармацыі таксама бярэ самы актыўны ўдзел. Так, першы намеснік міністра інфармацыі Лілія Ананіч — намеснік старшыні рабочай групы. А нашы калегі-выдаўцы з іншых краін аказваюць добрую кансультацыйную дапамогу. У прыватнасці, Беларусь з'яўляецца пастаянным удзельнікам Міжнароднага конкурсу «Мастацтва кнігі» краін-удзельніц СНД. Гэтае творчае спаборніцтва — выдатная магчымасць атрымаць параду ад калег, у тым ліку Арменіі, чыя сталіца ўжо атрымлівала ганаровае званне, за якое мы будзем змагацца. Калегі з Ерэвана аказваюць нам кансультатыўную дапамогу па ўсіх пытаннях.

Старшыня Мінскага гарадскога аддзялення Саюза пісьменнікаў Беларусі Міхась Пазнякоў:

— Мінск з'яўляецца магутным ... цыянальным і міжнародным цэнтрам кнігі. У нашым горадзе працуюць многія творцы, якія пішуць не толькі па-беларуску і па-руску, але на іншых рэдкіх мовах.

Да прыкладу, у Саюзе пісьменнікаў Беларусі ёсць сябры, што пішуць на фарсі, армянскай, курдскай, персідскай, балгарскай мовах. У нашай краіне выдаюцца і іх кнігі. Натуральна, іх не так шмат, але не варта забывацца на тое, што і падобныя выданні тут таксама прадстаўленыя. Думаецца, што Саюз пісьменнікаў Беларусі здольны прымаць самы непасрэдны ўдзел у стварэнні прапаноў па правядзенні такога значнага міжнароднага свята. Гэта цікавыя акцыі, прэзентацыі, імпрэзы.

І нам сапраўды ёсць што прадставіць. Толькі ў Мінску за год выпускаецца як мінімум 200 кніг сучасных аўтараў і прыкладна столькі ж выданняў класікі — беларускай, рускай, замежнай. А СПБ праводзіць вялікую культурна-асветніцкую работу па прадстаўленні і папулярызацыі кнігі. За год адбываецца больш як 2 тысячы самых розных мерапрыемстваў — прэзентацый, творчых вечароў, юбілейных сустрэч, паэтычных чытанняў — у бібліятэках, музеях, школах, установах культуры. Ствараюцца і працуюць літаратурныя клубы, студыі, аб'яднанні, гасцёўні.

Думаю, што самы галоўны абавязак пісьменнікаў — пісаць кнігі, забяспечыць непарыўны літаратурны працэс. Больш за тое, мы заўсёды рады сустрэцца з чытачамі, прадставіць свае творы як мага больш шырокай аўдыторыі.



Фота Ганны Сусаевай

Намеснік старшыні Беларускага фонду культуры Тадэуш Стружэцкі:

— Каб абмеркаваць гэтае важнае пытанне, мы сабраліся зусім не рана, а можа, нават позна. З мая 2012 года, калі была прапанавана сама ідэя, прайшло ўжо даволі многа часу, і перад намі вельмі аб'ёмны і складаны праект. Безумоўна, рэалізаваць яго будзе няпроста, бо прэтэндэнтаў на статус Сусветнай сталіцы кнігі многа і адбіраюцца яны вельмі дакладна, скрупулёзна, іх разглядае некалькі міжнародных арганізацый на чале з ЮНЕСКА.

Безумоўна, каб мець магчымасць прэтэндаваць на такі статус, краіне трэба мець досыць шмат перадумоў для святкавання, а іх у нас якраз дастаткова. Але нават напярэдадні прыняцця непасрэднага рашэння і атрымання гэтага статусу нам трэба рэалізаваць цэлы комплекс мерапрыемстваў, якія будуць працаваць на карысць нам.

Гэты праект можа быць паспяхова рэалізаваны толькі пры цесным супрацоўніцтве дзяржаўных органаў, устаноў і арганізацый, грамадскіх арганізацый і шырокай грамадскасці. Бо асноўная яго ідэя — рашэнне праблем папулярызацыі чытання ва ўсіх краінах. Яна сёння мае глабальны характар, таму у многіх краінах праграмы па прасоўванні, падтрымцы чытання маюць статус дзяржаўных.

Мне давялося быць у складзе дэлегацыі падчас правядзення мерапрыемстваў з нагоды надання Ерэвану статусу Сусветнай сталіцы кнігі. Сапраўды, гэта была вельмі яркая падзея для ўсіх асцей, што прыехалі ў Ерэван, але вельмі значным святкаванне сталася перш за ўсё для жыхароў Арменіі. Гэта нацыянальнае свята, што аб'ядноўвала ці дадаткова аб'ядноўвала армянскую нацыю. Армянская дыяспара вельмі актыўна брала ўдзел у рэалізацыі гэтага праекта. Больш за тое, прадстаўнікі дыяспары падарылі ўдзельнікам святкавання выдатны канцэрт сусветна вядомага тэнара з Італіі Андрэа Бачэлі, яны дапамаглі арганізаваць у многіх краінах свету цэлы шэраг мерапрыемстваў, у прыватнасці, выстаўкі кніг-старадрукаў, а таксама армянскага мастацтва ў Іспаніі, Італіі, Амерыцы. У гэтых імпрэзах удзельнічалі прадстаўнікі вышэйшых органаў улады краіны. Самі імпрэзы адбываліся 23 красавіка, у Сусветны дзень кнігі і аўтарскага права. Менавіта 23 красавіка штогод пачынаецца рэалізацыя таго праекта.

Мяне таксама ўразіла, што амаль ва ўсіх мерапрыемствах у Ерэване з нагоды надання гэтаму гораду статусу Сусветнай сталіцы кнігі браў удзел прэзідэнт краіны, а разам з ім і іншыя высокія чыноўнікі. Тут прысутнічалі дэлегацыі з 30 краін свету, кіраўнікі ўсіх міжнародных арганізацый. Але, як мне падаецца, самым галоўным быў настрой, які панаваў падчас свята. Гэта было нацыянальнае святкаванне сяброўства, яднання, адчування сваёй нацыянальнай годнасці. Вось яна, звышмэта, якая, на мой погляд, і павінна ставіцца пры рэалізацыі гэтага праекта.

Можа, мы яшчэ недастаткова адчуваем значнасць справы. Сапраўды, гэта не толькі клопат міністэрстваў, гэта клопат усёй краіны. Бо калі горад Мінск атрымае гэты надзвычай ганаровы статус, то рэалізацыя мерапрыемстваў павінна ажыццяўляцца па ўсёй краіне. Спраў хопіць усім.

У Ерэване падчас святкавання адбылася міжнародная кніжная выстаўка «Арменія-экспа», дзе былі прадстаўлены кніжныя выданні з большасці краін свету, у тым ліку і годная экспазіцыя Беларусі. Прайшло адкрыццё помніка кнізе, шэраг іншых імпрэз. Той знакавы год пакінуў памяткі на многія дзесяцігоддзі. Думаю, што і нам варта звяртаць увагу не толькі на эпізадычныя імпрэзы, але і на справы, якія мусяць запомніцца на наступныя дзесяцігоддзі, нават стагоддзі.

Сёння працэс падрыхтоўкі дасье павінен ісці больш актыўна, больш за тое, яно мусіць рыхтавацца не вузкім колам, а з шырокім абмеркаваннем, з удзелам усіх зацікаўленых. Дасье — базавы дакумент, які стане падставай для атрымання гэтага высокага статусу. Думаецца, у Мінска ёсць усе шанцы, у гэтым выпадку у 2017 годзе мы ўсе з вялікім гонарам, задавальненнем і радасцю не толькі возьмем удзел у святочных мерапрыемствах, але і будзем адчуваць сябе арганізатарамі.

Старшыня Беларускага фонду культуры Уладзімір Гілеп:

— Не так даўно я прысутнічаў на пасяджэнні Нацыянальнай камісіі Рэспублікі Беларусь па справах ЮНЕСКА. Варта падкрэсліць, што ў план работы гэтай камісіі на 2014 — 2015 год ужо ўключана пытанне «Мінск — сусветная сталіца кнігі-2017». Прагучаў даклад намесніка міністра культуры Васіля Чэрніка, потым прайшло кароткае абмеркаванне таго, што для нас не простая справа дабіцца гэтага высокага звання і што трэба ўжо цяпер пачынаць самую актыўную работу па падрыхтоўцы.

Я не так даўно быў у Стакгольме і звярнуў увагу на тое, што ў грамадскім транспарце людзі чытаюць кнігі прыкладна так жа масава, як мы чыталі гадоў 20 таму. У нас жа кніга сёння замяняецца іншымі папулярнымі электроннымі дэвайсамі.

Мяркую, што цяпер варта думаць пра аб'яднанне намаганняў у галіне папулярызацыі кнігі і чытання. Дзяржава мусіць працаваць у гэтым кірунку разам з грамадскасцю, грамадскімі арганізацыямі. Беларускі фонд культуры выдае не так многа кніг, мы ў асноўным займаемся іх папулярызацыяй. Наша «Краязнаўчая газета» таксама служыць гэтым мэтам.

Але трэба думаць перш за ўсё пра тое, якую кнігу мы будзем папулярызаваць. Гэта павінна быць беларуская кніга, магчыма, выдадзеная на розных мовах. Гэта можа стаць тым плюсам, што дазволіць нам дамагчыся гонару называцца кніжнай сталіцай свету-2017.

Галоўны дырэктар радыё «Беларусь», старшыня суполкі «Полацкае зямляцтва» Навум Гальпяровіч:

— Слынныя імёны нашых першадрукароў, асветнікаў звязаныя не толькі з Полацкам, але ж гэты горад — першы культурны, асветніцкі, дзяржаўны цэнтр Беларусі. Сёння Мінск — сталіца Беларусі, і імідж краіны, якая выдае, любіць і чытае кнігі, павінен фарміравацца ў Мінску.

Мне хацелася б падкрэсліць, што дзеля таго, каб гэта адбылося, каб мы ў свеце заявілі пра сябе як пра нацыю, якая пісала, выдавала кнігі, трэба ў сусветных СМІ гаварыць пра Беларусь, нашу гісторыю, культуру. Мы толькі цягам апошніх некалькіх дзясяткаў гадоў самі сталі адкрываць для сябе многія старонкі нашай гісторыі, культуры. Яшчэ адна важная акалічнасць: для таго каб «раскручваць» імідж нашай краіны як прэтэндэнта на званне Сусветнай кніжнай сталіцы, варта падкрэсліваць тое, што многія беларусы, ураджэнцы гэтай зямлі зрабілі шмат для развіцця іншых краін. Па сведчанні нашага вядомага даследчыка прафесара Адама Мальдзіса, каля трох тысяч выдатных дзеячаў сусветнай культуры — родам з Беларусі. Наша зямля была донарам вайсковых, навуковых, асветніцкіх кадраў для многіх краін. І калі мы гаворым пра дзеячаў сусветнай культуры, нашых суайчыннікаў, то варта звярнуць увагу, што яны належаць не толькі беларусам. Да прыкладу, Францыск Скарына — значны дзеяч эпохі Адраджэння, як і Мікола Гусоўскі, а роля Сімяона Полацкага надзвычай вялікая ў развіцці расійскай, сусветнай культуры.

Што да міжнароднага радыё «Беларусь», якое мне выпаў гонар узначальваць, мы працуем на васьмі мовах і, канечне, пры падрыхтоўцы да гэтай вялікай акцыі гатовы стаць інфармацыйным партнёрам: расказваць на ўсіх васьмі мовах, падкрэсліваць значнасць і важнасць гэтай падзеі. Мы павінны падключыцца да сусветнай прапаганды гэтай акцыі! Вельмі важна, каб сапраўды было прынята такое рашэнне, але дзеля гэтага трэба зрабіць максімум намаганняў, сканцэнтраваць іх дзеля таго, каб справа вырашалася не ў вузкім коле, а ахапіла усё грамадства. Каб людзі ведалі пра святкаванне не толькі ў Мінску, але і ў кожным беларускім горадзе.

У нас многа цікавых гарадоў з традыцыямі, шмат людзей, якія могуць падключыцца да правядзення гэтага свята, калі будзе прынята такое рашэнне. Цяпер варта працаваць на яго прапаганду не толькі ў мясцовым, але і ў міжнародным фармаце.

Вольга Аляксеева, загадчык аддзела кнігавыдання Выдавецкага дома «Звязда»:

— Мы ўжо не першы год плённа працуем у напрамку наладжвання міжнародных сувязей у галіне кнігавыдання. Сёлета можам прадставіць як беларускаму, так і замежнаму чытачу серыю кніг «Сугучча сэрцаў», якая вельмі шырока папулярызавалася ў апошнія месяцы. У гэтыя зборнікі ўвайшлі творы пісьменнікаў з Беларусі і краін СНД.

На 2014 год запланаванае выданне новай серыі кніг для дзяцей. Яе назва перагукаецца з папярэдняй: «Сугучча сэрцаў»: казкі пісьменнікаў свету». Творы замежных аўтараў будуць перакладацца на беларускую мову і выходзіць асобнымі кнігамі. Адкрые серыю зборнік казак беларускіх аўтараў, які мы спадзяёмся прадставіць падчас Мінскай міжнароднай кніжнай выстаўкі-кірмашу, што пройдзе ў лютым. Запланавана таксама арганізацыя «круглага стала» з удзелам замежных дзіцячых пісьменнікаў, а таксама форуму замежных дзіцячых пісьменнікаў у лагеры «Зубронак».

Варта згадаць яшчэ некаторыя нашы кнігі, што выйшлі цягам апошніх гадоў і прадстаўляюць замежную літаратуру ў Беларусі ці беларускую літаратуру за мяжой. Гэта выданне «Пад крыламі Дракона», зборнік вершаў 100 паэтаў Кітая, укладальнікам якога з'яўляецца Мікола Мятліцкі. «Казкі дзяцей Беларусі» на беларускай і нямецкай мовах таксама могуць зацікавіць замежнага чытача. Летась пабачыла свет кніга Алены Брава «Дараванне», дзе пад адной вокладкай змешчаны тэкст аповесці на беларускай, рускай і нямецкай мовах. Гэта выданне прэзентавалася на міжнароднай кніжнай выстаўцы ў Франкфурце-на-Майне. Не так даўно выйшла кніга перакладаў Ніны Мацяш «Гарнуся душою да слова», куды ўвайшлі творы класікаў украінскай літаратуры. Я б прапанавала ўвазе шырокай грамадскасці і кнігу польскага пісьменніка Станіслава Лема «Непераможны» ў перакладзе Анатоля Бутэвіча. Аддзел кнігавыдання Выдавецкага дома «Звязда» шмат увагі звяртае на праекты, якія маюць міжнародны характар. Мы спадзяёмся, што яны прынясуць карысць чытачу і атрымаюць высокую ацэнку.

> *«Справа змагання за статус Сусветнай сталіцы кнігі — надзвычай няпростая. Да прыкладу, на 2014 год намініраваўся моцны кніжны цэнтр — Вільнюс — і не прайшоў. Многія буйныя гарады свету ўжо падавалі свае дасье і таксама не прайшлі. Таму сёння нам трэба вельмі разумна і актыўна папрацаваць…*

Адметна, што гэты «круглы стол» стаўся не толькі пляцоўкай для абмену думкамі і набыткамі працэсу падрыхтоўкі дасье, але і даў магчымасць актыўнага сумеснага абмеркавання актуальных пытанняў. Падчас пасяджэння прагучалі нават прапановы па правядзенні святочных мерапрыемстваў, вызначыліся і некаторыя адметнасці нашай культуры, якія могуць стаць тымі «фішкамі», у пошуку якіх зацікаўлена Міністэрства культуры краіны.

Так, **Тадэуш Стружэцкі** падкрэсліў:

— У 2016 годзе будзе адзначацца 950-годдзе з дня заснавання першай у Беларусі старэйшай усходнеславянскай бібліятэкі, бібліятэкі полацкага Сафійскага сабора. Гэта таксама вельмі важная падзея, і яна павінна ўвайсці ў праграму мерапрыемстваў. Больш за тое, вельмі многае можа зрабіць Міністэрства замежных спраў нашай краіны ў кірунку папулярызацыі, прэзентацыі беларускай кнігі ў свеце. Дыпламатычныя прадстаўніцтвы Беларусі працуюць амаль у 70 краінах свету, і, канечне, яны маюць усе падставы і ўмовы для папулярызацыі беларускай літаратуры. А гэта самае недарагое мерапрыемства. Арганізаваць паездку для аднаго пісьменніка з кнігамі значна прасцей, чым прадставіць замежнаму гледачу творчы калектыў з 15 — 20 чалавек. А эфект ад прэзентацыі выдання, сустрэчы з аўтарам будзе вельмі высокі.

Уладзімір Гілеп дадаў:

— Чаму б нам не прапанаваць разам са сталіцай кнігі ў Мінску зрабіць яе філіял у Полацку як горадзе-калысцы беларускай кніжнасці? Такой прапановы ў ЮНЕСКА магло яшчэ не быць. Гэтым мы зможам адрозніваца ад іншых краін.

Прагучала таксама прапанова падрыхтаваць да выдання збортвораў беларускіх пісьменнікаў, якія жывуць за мяжой. Яны самі маглі б падключыцца да прэзентацыі як саміх кніг, так і ідэі аб'яднання Мінска Сусветнай кніжнай сталіцай.

У цэлым свае ідэі адносна правядзення магчымых акцый, прэзентацый, імпрэз у розных гарадах Беларусі можа дасылаць абсалютна кожны. Іх варта скіроўваць на адрас Міністэрства культуры ці Міністэрства інфармацыі нашай краіны. У будучым плануецца стварэнне адмысловага гарадскога сайта, дзе будуць акумуліравацца ўсе ідэі і прапановы, а таксама размяшчацца актуальныя навіны падрыхтоўкі дасье для ЮНЕСКА. Такім чынам усе зацікаўленыя справай беларусы змогуць уключыцца ў працэс вылучэння Мінска на званне Сусветнай сталіцы кнігі-2017.

Марына ВЕСЯЛУХА